Источник: “Наша слова” – 2014-05-28

# Жыццё, аддадзенае вывучэнню мовы

## (да 90-годдзя з дня нараджэння прафесара А. П. Груцы)

Аляксей Пятровіч Груца нарадзіўся 9 траўня 1924 года ў вёсцы Пішчыкі Дубровенскага раёна Віцебскай вобласці. У 1951 годзе скончыў Менскі педагагічны інстытут. Выкладаў беларускую мову і літаратуру ў школах Менска. З 1957 года - навуковы супрацоўнік сектараў лексікалогіі і лексікаграфіі, дыялекталогіі, гісторыі беларускай мовы Інстытута мовазнаўства АН Беларусі. У 1969 годзе А.П. Груца перайшоў працаваць у Менскі педінстытут. Спачатку ён працуе на кафедры гісторыі рускай мовы, з 1972 года - загадчык кафедры рускай мовы, з 1982 года - прафесар (у 1990-91 гадах - загадчык кафедры агульнага і рускага мовазнаўства) гэтай педагагічнай установы.

Аляксей Пятровіч даследаваў дыялекталогію беларускай мовы, гістарычную граматыку і лексікалогію рускай і беларускай моў, лексіку Якуба Коласа, старaславянскую мову. Аўтар шматлікіх артыкулаў па гісторыі складаных форм будучага часу дзеясловаў, пра развіццё складаназалежнага сказа ў беларускай мове. У манаграфіі "Развіццё складаназалежнага сказа ў беларускай мове" (1970) на матэрыяле помнікаў пісьменнасці XIV-XVIII ст., фальклорных твораў і народных гаворак глыбока прааналізаваў складванне і развіццё ў беларускай мове складаназалежных сказаў з рознымі даданымі часткамі - дзейнікавымі, выказнікавымі, дапаўняльнымі, азначальнымі, акалічнаснымі, параўнальнымі і ўступальнымі. Асаблівая ўвага ў манаграфіі звернута на сродкі сувязі даданых частак з галоўнай - падпарадкавальныя злучнікі, злучальныя словы, трывальна-часавыя формы дзеясловаў-выказнікаў у прэдыкатыўных частках, семантыка-граматычныя адносіны паміж імі.

Гэта манаграфія стала базай для доктарскай дысерта-цыі Аляксея Пятровіча, якую ён абараніў у 1969 годзе. У 1971 годзе ён атрымаў вучонае званне прафесара.

А. П. Груца - адзін са складальнікаў акадэмічнага "Беларуска-рускага слоўніка" (1962), суаўтар акадэмічных прац "Дыялекталагічны атлас беларускай мовы" (1963), "Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак" (1968-1969). Аляксей Пятровіч таксама актыўна працаваў над укладаннем акадэмічнага "Гістарычнага слоўніка беларускай мовы", вып. 1-3 (1982-1983), вып. 7-9 (1986-1989), вып. 12-17 (1993-1997), вып. 19-21 (2000-2005). Ён таксама з'яўляецца актыўным суаўтарам "Лексічнага атласа беларускіх народных гаворак" у 5 тамах (1994-1998). У 2000 годзе апошняя праца ўдастоена Дзяржаўнай прэміі Рэспублікі Беларусь. Апошнія дзесяціґоддзі прафесар А.П. Груца працаваў без адрыву ад асноўнай работы на кафедры тэорыі і гісторыі мовы Беларускага дзяржаўнага педагагічнага ўніверсітэта імя Максіма Танка.

У розных айчынных і замежных выданнях Аляксеем Пятровічам Груцам апублікавана каля 80 навуковых артыкулаў па гісторыі аднакаранёвых слоў у беларускай, рускай і часткова ўкраінскай і польскай мовах.

Акрамя параўнальна-супастаўляльнага вывучэння блізкароднасных рускай і беларускай моў на ўзроўні марфалогіі, сінтаксісу, лексікі і фразеалогіі, А.П. Груца займаецца падрыхтоўкай падручнікаў для студэнтаў вышэйшых навучальных устаноў Рэспублікі Беларусь. Так, ён выдаў падручнікі: "Старославянский язык" (Мінск, 2004) і "Старославянский язык: Практический курс" (Мінск, 2005) і падрыхтаваў "Сборник заданий и упражнений по старославянскому языку".

Аляксей Пятровіч Груца прысвяціў выкладчыцкай і навукова-даследчай дзейнасці ў галіне мовазнаўства каля 60 гадоў жыцця. Ім апублікавана каля 200 навуковых прац памерам каля 200 друкаваных аркушаў.

Як суаўтару акадэмічных прац "Дыялекталагічны атлас беларускай мовы" (1963), "Лінгвістычная геаграфія і групоўка беларускіх гаворак" (1968-1969) разам з іншымі даследчыкамі А.П. Груцу ў 1971 годзе прысуджана Дзяржаўная прэмія СССР.

У красавіку 1984 года прафесар А. П. Груца быў узнагароджаны знакам "Выдатнік народнай асветы", у красавіку 1987 года - медалём "Ветеран труда", а ў 1999 годзе за дасягнутыя поспехі ў галіне нацыянальнай мовы, культурна-асветніцкай дзейнасці - Ганаровай граматай Савета Міністраў БССР.

Слынны спецыяліст у галіне беларускага мовазнаў-ства і выкладчык вышэйшай навучальнай установы доктар філалагічных навук, прафесар, лаўрэат Дзяржаўнай прэміі СССР, выдатнік народнай асветы Беларусі Аляксей Пятро-віч Груца зрабіў у навуцы і выкладчыцкай сістэме вельмі многа.

Супрацоўнікі Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь, вучоныя-калегі і шматлікія студэнты многіх пакаленняў віншуюць з 90-гадовым юбілеем шаноўнага Аляксея Пятровіча і жадаюць яму моцнага здароўя, шчасця ў жыцці і здзяйснення ўсіх планаў і задум.